**ДУК “Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Варанцэвічская сельская бібліятэка-філіял № 17**

# “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем”

Краязнаўчы праект

***Актуальнасць, мэта і задачы праекта***

Краязнаўства заўсёды з'яўлялася адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэкі аграгарадка Варанцэвічы. Варанцэвічскі край і, наогул, Талачыншчына мае адметную прыроду, самабытную культуру, багатае мінулае, якое неабходна вывучаць і зберагаць для будучых пакаленняў шляхам развіцця краязнаўчай дзейнасці.

Цікавасць да пазнання сваёй малой радзімы, вывучэнне мясцовасці ў гістарычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці – тэндэнцыя сучаснасці. Праводзімыя мерапремствы па рэалізацыі дадзенага праекта карысталіся попытам сярод чытачоў бібліятэкі і жыхароў населеных пунктаў зоны абслугоўвання. У сувязі з гэтым па дадзенаму накірунку дзейнасці Варанцэвічскай сельскай бібліятэка-філіяла вырашана прадоўжыць рэалізацыю дадзенага праекта, які быў распрацаваны ў 2020 годзе.

***Мэтавая аўдыторыя:*** падлеткі, моладзь, жыхары вёсак Варанцэвічы, Любанічы, Лагаўшчына, Башарова.

***Тэрмін рэалізацыі праекта:*** 2023 год.

***Партнёры праекта:***

- ДУК “Варанцэвічскі сельскі Дом культуры Талачынскага раёна” (Бараноўская Я.В., загадчыца);
- Воўкавічскі сельскі Савет (Шумай І.В. – старшыня);
- цэнтральная раённая бібліятэка (В.П. Казлова – метадыст аддзела маркетынгу; І.А. Труханёнак – бібліятэкар аддзела маркетынгу).

***Чаканыя вынікі.*** У выніку праекта будуць створаны:

- больш дасканалая частка краязнаўчай картатэкі;
- папоўнены фонды бібліятэкі згодна тэмы праекта;
- зроблены папкі-дасье па гісторыі края і аб лёсах землякоў;
- падрыхтаваны цыклы публікацый у перыядычным друку па выніках работы.

***Структура праекта.***

- ***Гісторыя края, фальклор:*** збіраць і запісваць легенды краю аб паходжанні назваў вёсак, урочышчаў, вуліц, збіраць матэрыялы аб народных промыслах і мясцовых майстрах і г.д. Сабраць назапашаныя матэрыялы ў тэматычныя альбомы і папкі.
- ***Літаратурнае краязнаўства:*** даследванне літаратурнай спадчыны края праз знаёмства з біяграфіяй і творчасцю пісьменнікаў, паэтаў, мовазнаўцаў роднага краю і вывучэнне твораў розных жанраў, разнастайных па зместу і тэматыцы.
- ***Вывучэнне жыцця славутых землякоў:*** вывучэнне канкрэтных чалавечых лёсаў, у першую чаргу “блізкіх” людзей – сваякоў, землякоў, вывучэнне паўсядзённасці, жывога жыцця з яго звычайнымі падрабязнасцямі. Знаёмячыся з жыццём землякоў, можна знаходзіць у іх падставы для гонару за сваю зямлю і яе людзей, на чым і грунтуецца любоў да Айчыны, жаданне служыць ёй, працаваць на карысць гэтых людзей.

*План рэалізацыі праекта на 2023 год*

| № п/п | Змест работы | Тэрмін | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Распрацоўка канкрэтных мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта на 2023 год; абмеркаванне і зацвярджэнне плана мерапрыемстваў праграмы | студзень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В.. загадчык сельскага дома культуры; Шышкова А.П., загадчык аддзела маркетынгу ЦРБ |
| 2. | Вядзенне пошукава-даследчай работы па выяўленні і зборы дакументаў, якія дапамогуць захаваць памяць аб подзвігу ўдзельнікаў вайны, выкарыстоўваючы розныя крыніцы: перапіску са сваякамі, гутаркі з ветэранамі і ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, вывучэнне краязнаўчай літаратуры, архіўных матэрыялаў | на працягу года | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 3. | Афармленне творчай справаздачы аб рэалізацыі краязнаўчага праекту “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем” | снежань | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| ***Альбомы*** | | | |
| 4. | “Гісторыя роднай вёскі Варанцэвічы” (дапоўніць) | студзень | Лазоўская Н.В.. бібліятэкар філіяла № 17 |
| 5. | “А ў нашых хатах майстры жывуць” (дапоўніць) | кастрычнік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| ***Тэматычныя папкі*** | | | |
| 6. | “Слова пра Героя” (старонкі жыцця Героя Савецкага Саюза, камандзіра разведкі партызанскай брыгады “Чэкіст” Мамадалі Топвалдыева) | май | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 7. | “Бульбяны разгуляй” (гісторыя раённага брэндавага свята ў межах праекта “Мая спадчына”) | кастрычнік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| ***Картаграфічны матэрыял*** | | | |
| 8. | “Варанцэвічы на карце Беларусі” | люты | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Шнырко В.В., мастак-афарміцель |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Кніжныя выставы і экспазіцыі* | | | |
| 9. | Выстава-юбілей “Віцебская вобласць – Радзіма твая і мая” (да 85-годдзя заснавання вобласці) | студзень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 10. | Папоўніць новымі экспанатамі музейны пакой з захаваннем мясцовых традыцый пад назвай “Беларуская хата” (сумесна з СДК) | сакавік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| 11. | Выстава-хобі мастацкіх работ чытачкі Бараноўскай К.С. “Умелых рук цудоўныя стварэнні” | ліпень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 12. | Фотавернісаж “Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы” | жнівень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| 13. | Выстава-парада “Бульба – усяму галава” (да раённага брэндавага свята бульбы “Бульбяны разгуляй-2023!”) | кастрычнік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| ***Масавыя мерапрыемствы*** | | | |
| 14. | Урок-даследаванне “Адкуль мой род?” | сакавік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 15. | Гадзіна цікавых паведамленняў “Па прыступках часу”(да 590-годдзя з дня першага ўпамінання ў летапісу г.Талачына) | жнівень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 16. | Раённае брэндавае свята бульбы “Бульбяны разгуляй-2023!“ у рамках праекта “Мая спадчына” | кастрычнік | Лазоўская Н.В.. бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17. | Краязнаўчая вечарына “Мне выпала шчасце тут нарадзіцца” | лістапад | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| ***Да  78 гадавіны Вялікай Перамогі*** | | | |
| 18. | Выстава-напамін “Абавязаны памятаць” | май | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| 19. | Літаратурна-музычны вечар “У часа свая памяць” | май | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| 20. | Патрыятычная акцыя “Голуб міру” | красавік-май | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17 |
| ***Адраджэнне нацыянальных традыцый, абрадаў і святаў*** | | | |
| 21. | Фальклорнае свята “Масленіца добрая – шырокая  яе душа” | сакавік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; БараноўскаяЯ.В., загадчык сельскага дома культуры |
| 22. | Фальклорнае свята “У Купальскі вечарок” | ліпень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Бараноўская Я.В., загадчык сельскага дома культуры |
| ***Выдавецкая дзейнасць*** | | | |
| 23. | “Краязнаўчы каляндар Талачыншчыны на 2023 год” | студзень | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Труханёнак І.А., бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу |
| 24. | “Партызанская брыгада “Чэкіст”: буклет | май | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | Труханёнак І.А., Труханёнак І.А., бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу |
| 25. | “Варанцэвічскія краявіды”: серыя бібліятэчных паштовак да брэндавага свята | кастрычнік | Лазоўская Н.В., бібліятэкар філіяла № 17; Труханёнак І.А., бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу |

Бібліятэкар Варанцэвічскай
сельскай бібліятэкі-філіяла № 17 Н.В. Лазоўская